# ЧАЛАВЕК, КОСМАС І СУСВЕТ

Памятайце, сябры: шлях у космас для кожнага з нас пачынаецца тут, на Зямлі.

*Юрый Гагарын*



Пры вывучэнні твораў раздзела:

✓ **будзем знаходзіць** пейзажныя замалёўкі, створаныя пісьменнікамі;

✓ **будзем вучыцца** слоўна маляваць фантастычныя і рэальныя карціны космасу і Сусвету; вызначаць асноўную думку твораў; выразна чытаць творы па ролях.

**Варта задумацца.** Навошта беларускія пісьменнікі звяртаюцца ў сваіх творах да касмічнай тэмы? Чаму ствараюць фантастычныя вершы, казкі і апавяданні?



Праваўладальнік Акадэмія адукацыі

## *У свеце прыгожага*

1. Разгледзьце фотаздымак Зямлі, зроблены спадарожнікам з космасу.



2. Адкажыце на пытанні.

1) Што, акрамя нашай планеты, вы яшчэ бачыце на здымку? Пералічыце.

2) Якіх колераў прысутнічае на Зямлі больш? Чаму?

3) Якія думкі і пачуцці выклікаў у вас гэты фотаздымак?

**Лад невымо́ўны** — *тут:* бязгучны выгляд касмічнай прыроды.

**Мле́чны Шлях** — скопішча зорак, якое светлавой паласой перасякае небасхіл.

**Сусве́т** — увесь свет, бясконцы ў часе і прасторы.

## Хараство Сусвету

*Васіль Жуковіч*

Так прыгожа ў Сусвеце!
Сонца днём, а ўночы зоры
над Зямлёй высока свецяць,
ззяе Месяц на прасторы.

У Сусвеце непаўторным,
таямніц, загадак поўным,
непарушна, так цудоўна
лад пануе невымоўны!

І планеты ў руху вечным,
і ў святле спрадвечным зоры!..
Шчасце жыць пад Шляхам Млечным,
слухаць музыку прасторы!



?

1. Якія пачуцці выклікаў у вас верш?
2. Якімі касмічнымі аб'ектамі захапляецца аўтар? Пацвердзіце гэта словамі з тэксту.
3. Вызначце асноўную думку верша.
4. Да якіх радкоў твора падыходзіць ілюстрацыя мастака?
5. У якім тэмпе трэба чытаць гэты верш? Чаму?



Праваўладальнік Акадэмія адукацыі